І В А Н   Ч Ы Г Р Ы Н А Ў

# ГОСЦІ

СУЧАСНАЯ ТРАГІКАМЕДЫЯ
Ў ДЗВЮХ ДЗЕЯХ



І В А Н   Ч Ы Г Р Ы Н А Ў

# ГОСЦІ

СУЧАСНАЯ ТРАГІКАМЕДЫЯ
Ў ДЗВЮХ ДЗЕЯХ

# ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ

- **Васіль Дзянісавіч Паўтарацкі.**
- **Валянціна Рыгораўна,** *яго жонка.*
- **Косця Яроцкі,** *малады чалавек.*
- **Навумчык,** *былы паліцай.*
- **Данута,** *маладая кабета.*
- **Андрэй Сцяпанавіч Шарэйша,** *так сама, як і Паўтарацкі, старшыня калгаса.*
- **Афіцыянтка** *калгаснага рэстарана.*
- **Міхаіл Хведаравіч Гарбавіцкі,** *былы палкоўнік дзяржаўнай бяспекі.*
- **Ліна.**
- **Стружка,** *доктар.*
- **Міліцыянер.**

# ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

## КАРЦІНА I

*Кватэра Паўтарадкага. Яна падобна на антыкварыят багадцем рэчаў, сярод якіх карціны, зброя, кубкі... Пасярод стаіць скульптурная выява гаспадара, захутаная ў марлю. На пастаменце – золатам літары: Двойчы Герой Сацыялістычнай Працы Васіль Дзянісавіч Паўтарацкі. Заходзіць сам Паўтарацкі.*

**Паўтарацкі** *(здымае марлю з скульптуры)*. Добры дзень, Васіль Дзянісавіч! *(Сядае ў крэсла насупраць)*. Якія навіны, пытаешся? О, іх многа, Васіль Дзянісавіч. Ну так, так, я разумею, трэба пачаць з галоўнай. Дык вось тры мужыкі ў Белавежскай пушчы пад чаркай адмянілі Савецкі Саюз. Так, так, адмянілі Савецкі Саюз. І адразу ж пахваліліся па тэлефоне прэзідэнту Бушу. Чаму, пытаешся, Бушу? Думаю, як галоўнаму рэжысёру па развалу Савецкага Саюза. Аказваецца, гэтая акцыя даўно планавалася. Сам жа ведаеш, яшчэ Гітлер з Гебельсам марылі раз'яднаць нашу краіну на ўдзельныя княствы. Пасля Трумэн, Рэйган са сваімі хаўруснікамі. А цяпер Буш. Яно і праўда, навошта каму такая магутная дзяржава, як Савецкі Саюз? Кажуць, імперыя. Затое ж магутная! Ці званілі, пытаешся, Гарбачову? Вядома, але першаму паведамілі ўсё-ткі Бушу ў Вашынгтон. Што сказаў Гарбачоў? Не ведаю. Пра гэта маўчаць. Хоць, канечне, можна здагадвацца – няйначай, Міхаіл Сяргеевіч ад злосці заплакаў недзе.

## КАРЦІНА II

*Заходзіць Валянціна Рыгораўна, жонка Паўтарацкага.*

**Валянціна Рыгораўна** *(усё роўна як здзіўлена)*. З кім гэта ты размаўляеш?

**Паўтарацкі.** Сам з сабой.

**Валянціна Рыгораўна.** А не баішся?

**Паўтарацкі.** Чаго?

**Валянціна Рыгораўна.** Што з глузду з'едзеш? Чуў жа, нябось, што здараецца з тымі, хто вось гэтак сам-насам загаворваецца?

**Паўтарацкі.** Я не адзін. У мяне ёсць да каго звяртацца. Вось. *(Паказвае на бюст)*. Галоўнае – у адухоўленасці. Бронзу таксама адухавіць можна. Так што, для мяне... Мне ж таксама іншы раз з разумным чалавекам пагаманіць ахвота.

**Валянціна Рыгораўна.** Лепей бы ты гэтага ідала вынес на вуліцу ды паставіў, дзе яму месца. Указа ж Прэзідыума Вярхоўнага Савета ніхто не адмяняў!

**Паўтарацкі.** Хочаш, каб з мяне смяяліся? Сацыялізма няма, а я, бачыш, усё яшчэ Герой Сацыялістычнай Працы? Не, Валянціна Рыгораўна, усё ўжо ў мінулым.

**Валянціна Рыгораўна.** Але ж ты не надта плачаш аб мінулым?

**Паўтарацкі.** А што мне плакаць? Гэта ён вось *(паказвае на скульптурную выяву)* няхай плача, што месца няма. А я жывы чалавек, прыстасуюся да новых умоў. Стану капіталістам. Акцыянерам.

**Валянціна Рыгораўна.** Ды ўжо сапраўды ходзяць чуткі, што ты калгас збіраешся разагнаць.

**Паўтарацкі.** Значыць, праўда. Але не разганяць, акцыяніраваць.

**Валянціна Рыгораўна.** Навошта табе гэта?

**Паўтарацкі.** Дзіўлюся, як ты не разумееш, дурніца! Наступае новае грамадства.

**Валянціна Рыгораўна.** Капіталістычнае?

**Паўтарацкі.** Сімбіёз. І я не хачу апынуцца за бартом у ім. Хачу стаць міліянерам, пахадзіць яшчэ па зямлі з палачкай у суправаджэнні вось такіх *(паказвае ў рост рукой)* бамбізаў-ахоўнікаў ды паадчыняць нагой якія захачу дзверы.

**Валянціна Рыгораўна.** А то да гэтага ты іначай адчыняў дзверы! Зоркі героя іх табе заўсёды адчынялі напята.

**Паўтарацкі.** Гэта не тое, не тое! Перад кожным цэкоўскім альбо саўмінаўскім чыноўнікам даводзілася шапку здымаць. Ці ж не помніш, колькі іх тут перабывала? І кожнага напаі, накармі ды яшчэ і ў багажнік аўтамашыны пакладзі. Цяпер усе мы незалежныя адзін ад аднаго. І разумныя.

**Валянціна Рыгораўна.** І колькі вас такіх разумных?

**Паўтарацкі.** Ды ўсе цяпер, лічы, разумныя. Як партыю развалілі, так і...

**Валянціна Рыгораўна.** Во-во, а то яна вас-ткі трохі і трымала за цуглі. Асаджала калі-нікалі. А цяпер і праўда – воля. Я толькі не разумею, як гэта вы ўмелі насіць на сабе маскі? Доўга і цярпліва?

**Паўтарацкі.** Ты гаворыш, як колішняя камсамолка.

**Валянціна Рыгораўна.** А ты, як выродзіўшыйся камуніст. Васіль, Васіль! Што з вамі стала?

**Паўтарацкі.** Ладна, ладна, не перашкаджай нам тут з Васілём Дзянісавічам. *(Паказвае рукой на бюст).*

**Валянціна Рыгораўна.** Юродствуеш?

**Паўтарацкі.** Я ж сказаў – маю патрэбу ў размове з разумным чалавекам. А зрэшты, чаго прыйшла? Што табе трэба?

**Валянціна Рыгораўна** *(махнула рукой)*. Ат... сапраўды. Я забыла. Званіў з Мінску Мішка...

**Паўтарацкі.** Не Мішка, а былы палкоўнік дзяржаўнай бяспекі Міхаіл Хведаравіч Гарбавіцкі. Ну і што?

**Валянціна Рыгораўна.** Казаў, што сёння прыедзе. Ты праўда прасіў яго, каб знайшоў масажыстку?

**Паўтарацкі** *(здзіўлена)*. Якую масажыстку? *(Нарэшце спахапляецца)*. А-а, ну прасіў, прасіў!

**Валянціна Рыгораўна.** Стары ты жарабок, вось што я скажу, Васіль Дзянісавіч, хоць і двойчы Герой Сацыялістычнай Працы. Мала ты іх тут перабраў? Мне б толькі паглядзець, хто каго ў вас трэ: яны цябе ці ты іх. Я гэтага палкоўніка дзяржаўнай бяспекі скора на парог пускаць перастану.

**Паўтарацкі.** Не кажы абы што! Мішка наш стары сябра, друг камсамольскага юнацтва!

**Валянціна Рыгораўна.** Ат, такі ж самы кабель, як і ты. Што ён толькі не выробляў у жыцці з бабамі! Мне ж Лёдзя яго скардзілася, як жывая была.

**Паўтарацкі.** Мужчыне адной бабы не хапае. Ты гэтага ніколі не разумела. І цяпер не разумееш. Састарылася, а не разумееш.

**Валянціна Рыгораўна** *(раззлавана)*. Затое ты ўсё разумееш!

**Паўтарацкі.** Ну-ну, ідзі! А то замінаеш нам з Васілём Дзянісавічам размаўляць.

*Валянціна Рыгораўна выходзіць. Але Паўтарацкі не распачынае далей гаворку са сваёй скульптурнай выявай. Доўга сядзіць моўчкі. Тады падыходзіць да сцяны, бярэ з яе вінтоўку. Адкрывае затвор, глядзіць у ствол. Але ў гэты момант зноў заходзіць яго жонка Валянціна Рыгораўна. Бачыць мужа з вінтоўкай.*

**Валянціна Рыгораўна.** Кінуў бы ты вазіцца са сваёй зброяй. І навошта яе табе столькі? І вінтоўка, і рэвальвер?

**Паўтарацкі.** Для палявання.

**Валянціна Рыгораўна.** Якое цяпер паляванне? Усе звяры перабеглі сюды з Чарнобыльскай зоны. Дзіўна, нашы дзікі бягуць у радыяцыю, а чужыя адтуль да нас.

**Паўтарацкі.** Адкуль ты ведаеш, што чужыя?

**Валянціна Рыгораўна.** Хіба ж у нас адзін паляўнічы?

**Паўтарацкі.** Міграцыя. Ведаеш, што такое міграцыя?

**Валянціна Рыгораўна.** Ты і ўпраўду лічыш аднаго свайго Васіля Дзянісавіча разумным?

**Паўтарацкі.** Нас двое.

**Валянціна Рыгораўна.** Не блазнуй Васіль. Грэх.

**Паўтарацкі.** Нічога, я з Філарэтах дружны. Адмовіць мне грахі. Я вось на царкву ўзнос добры ўнясу, так што... Ну, а на паляванне буду ездзіць на Далёк: Усход, калі свае дзікі ад радыяцыі прагорклі.

**Валянціна Рыгораўна.** Ты выйсце заўсёды знойдзеш.

**Паўтарацкі.** У мяне там, на Далёкім Усходзе, брокерскае месца.

**Валянціна Рыгораўна.** Калі ты паспеў?

**Паўтарацкі.** Умеючы – нядоўга. Але што табе зноў зарупіла? Чаму вярнулася?

**Валянціна Рыгораўна.** Я гэта ўспомніла. Пакуль у цябе госці будуць, ці не з'ездзіць мне да дачкі?

**Паўтарацкі.** Што ж, можна. Ухваляю.

**Валянціна Рыгораўна.** І яшчэ. Вырашыў бы ты неяк гэту справу з былым паліцаем...

**Паўтарацкі.** А што ён? Ну, прыехаў на канец жыцця ў вёску. Адсядзеў сваё.

**Валянціна Рыгораўна.** Мужыкі кажуць, што будзе дамагацца пры акцыяніраванні калгаса кампенсацыі за бацькаву зямлю.

**Паўтарацкі.** Ну і няхай патрабуе. Вольнаму воля. А ў нас праўленне гэтым будзе займацца.

**Валянціна Рыгораўна.** Людзі незадаволены...

**Паўтарацкі.** Ат, усё даўно быльняком парасло!

**Валянціна Рыгораўна.** Ну-ну, глядзі... Дык я вазьму машыну? Гэта ўсяго на які тыдзень?

**Паўтарацкі.** Але шафёра адразу ж адпусці. Лепей ён па цябе зноў прыедзе.

**Валянціна Рыгораўна.** Ладна. *(Выходзіць).*

## КАРЦІНА III

*Тая ж абстаноўка. Паўтарацкі поркаецца з вінтоўкай, падносіць да вачэй патроннік, зазірае туды, здаецца, наводзячы ствалом на скульптурную выяву. За акном чуецца песня, ну тая даўняя, дзе «партызанскія атрады занімалі гарады». Хтосьці грукае ў дзверы. Заходзіць чалавек з ружжом на плячы. Гэта калгасны трактарыст Косця Яроцкі. Яму гадоў пад трыццаць.*

**Паўтарацкі** *(ставячы вінтоўку прыкладам да падлогі)*. Што за экіпіроўка, Канстанцін Антонавіч?

**Яроцкі.** Іду ў партызаны. *(Паказвае цераз плячо вялікім пальцам на ружжо).*

**Паўтарацкі.** Куды?

**Яроцкі.** Кажу, Дзянісавіч, у партызаны.

**Паўтарацкі.** Дык апошні ж партызан пад Бабруйскам яшчэ летась з лесу выйшаў. Хіба не чуў?

**Яроцкі.** Як гэта?

**Паўтарацкі.** А так вось. Бадзяўся па лесе ажно з сорак чацвёртага года, а летась выходзіць ды пытае сустрэчнага чалавека: «Немцы ў вёсцы ёсць?» – «Якія табе немцы, – здзіўляецца чалавек, – вайна ж даўно скончылася». А той за вушы хапаецца: «Халера, а я ж яшчэ адну міну пад рэйкі паклаў на пад'ездзе к Асіповічам». *(Глядзіць на насцярожанага Яроцкага, тады гаворыць).* Ды ты, бачу, нічога не разумееш у жартах. Якраз вось тут, у канцы, трэба рагатаць. А ты...

**Яроцкі.** Кажу – іду ў партызаны.

**Паўтарацкі.** Ды ты, бачу, выпіў?

**Яроцкі.** А хоць бы і выпіў! Але маю права. Сёння, сам ведаеш, у нас выхадны. Дык я іду ў партызаны.

*Паўтарацкі вяртаецца да крэсла, сядае, ставячы на падлогу паміж каленяў вінтоўку.*

**Паўтарацкі.** Ну-тка, давай ўсё па парадку, Канстанцін Антонавіч. Нешта не разумею цябе.

**Яроцкі.** А што тут разумець, Дзянісавіч? Па вёсцы ходзіць былы паліцай. Навумчык.

**Паўтарацкі.** Ну і што?

**Яроцкі.** А тое, што гэты паліцай выдаў немцам майго дзеда Ігната, і тыя павесілі дзеда ў Клічаве.

**Паўтарацкі.** Ну я пра гэта чуў, што немцы павесілі твайго дзеда ў вайну.

**Яроцкі.** А тое, што выдаў яго Навумчык?

**Паўтарацкі.** І пра гэта я, здаецца, чуў.

**Яроцкі.** Што чуць? Важна ведаць. А ты не наш.

**Паўтарацкі.** Як гэта не ваш?

**Яроцкі.** Ну ў вайну ж тут не быў.

**Паўтарацкі.** Вайна даўно была, Канстанцін Антонавіч, а ты вось зараз блазнуеш.

**Яроцкі.** Але ж не дазволю паліцаю па вёсцы беспакарана хадзіць, няхай што і адсядзеў.

**Паўтарацкі.** Ен за твайго дзеда, відаць, адсядзеў, а ты збіраешся трапіць у турму праз яго. Закон цяпер на яго баку будзе, яго абараняць стане.

**Яроцкі.** Закон як хоча. А я за дзеда не дарую. Чаго ён прывалокся? Часы памяняліся? Няхай бы сабе дажываў недзе, навошта людзям душы трывожыць?

**Паўтарацкі** *(доўга глядзіць на хлопца)*. Ці не пагаварыць нам заўтра, га, Косця? Ты праспішся, а я падумаю. Можа, Ішчэ і патрэбы не будзе ісці ў партызаны?

**Яроцкі.** Ты мяне не разумееш, Дзянісавіч!.. У самы раз, а то позна стане, як павылязаюць гэтыя аблезлыя тараканы. Не, я, Дзянісавіч, іду ў партызаны, а ты думай. Ды глядзі, каб не позна было. І вінтоўка гэтая не выратуе.

*Яроцкі выходзіць. Праз момант чуецца з вуліцы тая ж песня пра партызан, якія некалі занімалі гарады... Паўтарацкі колькі часу стоена сядзіць у крэсле, затым рашуча ўстае, падыходзіць да тэлефона.*

**Паўтарацкі** *(па тэлефоне)*. Павел, ты чуеш, якія ў нас песні сёння спяваюць? Не, не па радыё. На вуліцы. Ну-ну, паслухай. *(Чакае)*. Паслухаў? Дык вось, гэта Косця Яроцкі наважыўся ісці ў партызаны. Якія партызаны? У самыя сапраўдныя. У яго патранташ і пушка. Не ведаю, як хто, а я не жартую. Што ў нас там за паліцай па калгасу ходзіць? Ну так. Чуў я гэту вашу гісторыю. Дык

вось Косця і хоча помсціць за дзеда. *(Слухае)*. Не, з яго сённяшнім партызанствам не толькі блазенства. Тут можа здарыц- ца нешта такое, чаго... Не, не, Павел Усцінавіч, ты лепей паслухай мяне. Косця, канечне, вядомы шалапут, але... Пазвані ты міліцыянеру, нашаму ўчастковаму, няхай ён даставіць паліцая да мяне. *(Слухае)*. Баішся, каб канфлікт не выйшаў? А я, ты ведаеш, не баюся. Няхай скардзіцца. Ага, вось так, у суправаджэнні міліцыянера. *(Кладзе трубку)*.

*Заходзіць Валянціна Рыгораўна.*

**Валянціна Рыгораўна.** Даў бы ты, Васіль, для Тамары грошай?

**Паўтарацкі.** Я нядаўна даваў ёй. Няхай таксама зарабляюць. А то як паслухаеш нашага зяця, дык па часе падумаць, што ён самы...

**Валянціна Рыгораўна.** Ты несправядлівы да яго. Хлопец як хлопец. Яны ўсе цяпер такі.

**Паўтарацкі.** Не скажы, цяпер якраз столькі праныраў ды дзялкоў развялося, што ажно страшна іншым разам бывае. Дзе яны толькі хаваліся да гэтага? Бывала, перабярэш ледзь не цэлае пакаленне, каб добрага работніка знайсці, а тут... Быццам грыбы адкуль вырастаюць.

**Валянціна Рыгораўна.** Спрыяльная глеба. Ты ж сам яшчэ нядаўна сумаваў па ёй. Моў, не дазваляюць разгарнуцца. То разгортвайся.

**Паўтарацкі.** Ты вось што... Я тут падумаў... Я ўсё-ткі злятаю на Далёкі Усход. Я ж казаў табе... у нас там брокерскае месца. Да таго ж, штосьці мне не падабаецца тая біржа.

**Валянціна Рыгораўна.** Ціне занадта іх многа развялося, гэтых біржаў?

**Паўтарацкі.** Пакуль гэта як бурбулкі на вадзе. Адны лопаюцца, другія ўзнікаюць. Таму вось і трэба трымаць вуха пільна.

**Валянціна Рыгораўна.** Дык што сказаць Тамары? Грошы дасі?

**Паўтарацкі.** Скажы, што магазін, які будуецца ў Мінску, будзе яе. Я на яго акцыі вазьму.

**Валянціна Рыгораўна.** Ты гэта сур'ёзна?

**Паўтарацкі.** Ды ўжо куды больш... Жыццё такое... Усё ідзе ўраскідач. У далейшым я прадбачу яшчэ горшае. Нават такія моцныя гаспадаркі, як наша, доўга не вытрымаюць. На іх таксама накінуцца, акурат ваўкі тыя на стрыножанага каня. Так што...

**Валянціна Рыгораўна.** А што гэта Косця Яроцкі з ружжом па вуліцы сёння ходзіць?

**Паўтарацкі.** У партызаны збіраецца. Засаду хоча наладзіць на паліцая.

**Валянціна Рыгораўна.** Ат, ну вас! *(Выходзіць)*.

## КАРЦІНА IV

*Усё тая ж кватэра Паўтарацкіх з бюстам гаспадара – двойчы Героя Сацыялістычнай Працы. Паўтарацкі ходзіць у задуменні вакол скульптурнай*

*выявы, тады спыняецца, кладзе руку на пастамент, хоча зноў пачаць (або працягваць) маналог-дыялог, але ўчастковы міліцыянер прыводзіць былога паліцая Навумчыка. Міліцыянер падносіць руку да шапкі, хоча далажыць старшыні калгаса. Той спыняе.*

**Паўтарацкі.** Не трэба, не трэба, лейтэнант. Адышлі часы, калі мы ўсе казыралі. Можаш ісці. А вы *(да паліцая)*, калі ласка, сядайце. *(Паказвае на крэсла)*. Хоць бы і сюды.

**Навумчык** *(натапыраны, з пратэстам)*. Я буду скардзіцца! Хто вам дазволіў арыштоўваць мяне? Гэта мая вёска!

**Паўтарацкі** *(усё яшчэ стоячы побач са сваёй скульптурнай выявай)*. Адкуль гэта вы ўзялі, што вас арыштавалі? Проста я папрасіў адшукаць вас, вось і адшукалі. Ну а што міліцыянер знайшоў вас, дык... Словам, я не бачу ў гэтым факце ніякага злоўжывання.

**Навумчык** *(па-ранейшаму натапырана)*. Гэта вы не бачыце! Нездарма ж кажуць, у сваім воку і бервяна не бачаць, а ў чужым дык і парушынку, бо муляе. А я буду скардзіцца!

**Паўтарацкі.** Ну гэта ваша грамадзянскае права, грамадзянін.

**Навумчык.** Во, зноў па-лагернаму!

**Паўтарацкі.** А як бы вы хацелі? Як бы вы хацелі, каб вас называлі? Таварыш?

**Навумчык.** Чаму раптам «таварыш»? Здаецца ж, адышлі ўжо таварышы?

**Паўтарацкі.** А як тады?

**Навумчык** *(усё-ткі сядае ў крэсла насупраць Паўтарацкага)*. Ну спадар. Так прыстойней. Ды мне так, лічы, і больш значна.

**Паўтарацкі.** Ужо зваліся некалі так?

**Навумчык.** Во-во!

**Паўтарацкі.** А я ніяк не праглыну гэтае слова. Для мяне больш звычнае – гаспадар.

**Навумчык** *(мусіць, ужо зразумеў, што на павышаным тоне тут далёка не паедзеш)*. Дык гэта ж адно і тое. Толькі «спадар» гучыць найбольш далікатна. Як пан. Затое па-нашаму.

**Паўтарацкі.** Па-нашаму якраз больш дастойна гучыць «гаспадар». Ды і дакладна адпавядае сутнасці. Ну ды ладна, вы ведаеце, чаму я прасіў адшукаць вас? Чуеце, адшукаць, а не арыштаваць?

**Навумчык.** А вы калі-небудзь хадзілі па вуліцы пад наглядам міліцыянера?

**Паўтарацкі** *(смяецца)*. Хвала Богу, не даводзілася. Усё жыццё неяк пражыў без гэтага. Можа, цяпер вось... Ну ды ладна. Дык вы не адказалі мне.

**Навумчык.** Пра што?

**Паўтарацкі.** Ну... пра...

**Навумчык.** А-а, вы пра тое? Ды адкуль мне было здагадацца, дзеля чаго я спатрэбіўся? *(І тут жа зусім пра іншае)*. Скажыце, а гэта ваша *(паказаў на бюст)* выява?

**Паўтарацкі.** Хіба не падобны?

**Навумчык.** Дык... А я ўсё гляджу дык, здаецца ж, гэта вы, спадар старшыня? Ну так: і прозвішча на мармуры ваша і гэтыя залатыя літары пра двойчы героя. Дык чаму тады ў кватэры стаіць а не на вуліцы? Здаецца ж...

**Паўтарацкі** *(амаль са скрухай).* Зіма, грамадзянін Навумчык, зіма! Холадна цяпер выстаўляць чалавека на вуліцу, змерзне.

**Навумчык** *(смяецца).* Ці ж гэта перашкода для камня?

**Паўтарацкі.** На марозе і камень трэскаецца.

**Навумчык.** Ваша праўда, спадар старшыня. Вось жа сацыялізм ва ўяўленні бальшавікоў лічыўся самым моцным з усяго, што існавала на свеце, а трэснуў. Так што... Ды і савецкая ўлада... І камуністычная партыя...

**Паўтарацкі.** І як вы да гэтага ўсяго ставіцеся?

**Навумчык.** Станоўча. Я ж змагар супраць камуністычнага ладу. Вошы каміць давялося па астрогах ды лагерах, Хіба не ведалі?

**Паўтарацкі.** Чаму ж, пра гэта я ведаю, што вы ў вайну паліцаем служылі. За гэта і адказваць давялося.

**Навумчык.** Паліцай... гэта... Лепей гаварыць – калабарцыяніст. Нязгодны з існуючым ладам. Змагар.

**Паўтарацкі.** Але як не называй – усё роўна здраднік.

**Навумчык.** Я нікому не здраджваў. Я змагаўся супраць сталінскага крывавага рэжыму, супраць бальшавіцкага ладу.

**Паўтарацкі.** Гэта вы цяпер дадумаліся, ці яшчэ тады, пры немцах?

**Навумчык.** Мы і тады разумелі сёе-тое.

**Паўтарацкі.** Хто гэта мы?

**Навумчык.** Ну калабарцыяністы.

**Паўтарацкі** *(адступае ад свае скульптурнай выявы).* Не, грамадзянін Навумчык, гэта вы цяпер да ўсяго гэтага дадумаліся. Гэта вас нашы газеты гэтак прасвятлілі. Пра тое, што вы змагар, вы даўно ўжо забылі за свае пятнаццаць гадоў адсідкі, а тым больш – за астатні час, калі туляліся недзе па чужых краёх. А цяпер пасмялелі. І сутнасць здрадніка хочаце замяніць другой – калабарцыяніст, быццам гэтак прыстойней.

**Навумчык.** Вы, спадар старшыня, дзіўна разважаеце, як учора. А сёння ўжо сёння. А можа, не чытаеце газет, хоць і спасылаецеся на іх?

**Паўтарацкі** *(пачынае пахаджваць па пакоі).* Газеты я чытаю. Яны сёння розныя. Але не газеты ўрэшце будуць канчаткова вырашаць пра сапраўдную сутнасць здрадніцтва. Здраджвалі вы народу – народ і будзе вызначаць усё: і адносіны да вас, і якая сутнасць здрадніцтва. І гэта не газетная дэмагогія. Гэта нешта зусім іншае. Калі можна так сказаць, спрадвечнае.

**Навумчык.** А што вы, спадар старшыня, пячэціся аб народзе? Людзі ж мяне, здаецца, нядрэнна прымаюць у вёсцы?

**Паўтарацкі.** А вось унук вашага колішняга аднавяскоўца Косця Яроцкі...

**Навумчык.** Дык хуліган!

**Паўтарацкі.** Па-першае, ён не хуліган, а выдатны трактарыст. А па-другое, вы не далі мне дагаварыць. Дык вось Косця Яроцкі пагражае пайсці ў партызаны і наладзіць засаду на вас.

**Навумчык.** А вы што?

**Паўтарацкі.** А я, грамадзянін Навумчык, рашыў папярэдзіць вас. Таму і папрасіў адшукаць.

**Навумчык.** А што вы сказалі Яроцкаму?

**Паўтарацкі.** Каб праспаўся.

**Навумчык.** Во-во, спадар старшыня. Разумнае ваша рашэнне.

**Паўтарацкі.** А калі ён не праспіцца? Ну можа ж такое быць?

**Навумчык.** Тады яго ў каталажку. За ўгрозы грамадзяніну сувярэннай рэспублікі. Гэтага я ўжо сам магу дамагчыся. Проста звярнуся да пракурора.

**Паўтарацкі.** А як пракурор спозніцца?

**Навумчык.** Што значыць – спозніцца? Абавязаны.

**Паўтарацкі.** Ці мала як бывае? Дапусцім, уступіць у дзеянне наша звычайная бюракратыя з яе непаваротлівасцю?

**Навумчык.** Яны ж там, у пракуратуры, таксама на службе! Ды й не старыя часы. Цяпер дэмакратыя, галоснасць.

**Паўтарацкі.** Вось пра гэта, грамадзянін Навумчык, што цяпер дэмакратыя і галоснасць, і Косця Яроцкі ведае. Раней бы, як вы кажаце, пры старым рэжыме...

**Навумчык.** Не трэба перабольшваць, спадар старшыня. Я сказаў – пры старым часе. Хоць ваша вызначэнне больш дакладнае.

**Паўтарацкі.** Дзякуй за камплімент. Дык я, калі дазволіце, прадоўжу. Раней бы Косця Яроцкі наўрад ці адважыўся на такое. Закон мы тады блюлі. Ды і вы б вось гэтак нахабна, як сёння, не сталі б бадзяцца па вёсцы. Народ то і праўда стаў другі. Шмат што ўжо забылася пасля вайны.

**Навумчык.** Не толькі забылася, спадар старшыня, а і перайначылася.

**Паўтарацкі.** Я згодны – і перайначылася. Але даруйце мне, грамадзянін Навумчык, у мяне сёння не было намеру распачынаць з вамі дыскусію. Тым больш, што шмат у чым мы не сыйдземся, бо ваявалі ў розных лагерах.

**Навумчык.** І вы ваявалі? Вось бы не паверыў. З выгляду ж нібыта яшчэ малады.

**Паўтарацкі.** Ды я і кажу. Хоць народ наш і стаў другі, але грэблівасці да здраднікаў, ці як вы называеце цяпер сябе, не пазбавіўся. Ну а Косця Яроцкі проста ўзбурыўся. За дзеда свайго ўзбурыўся, якога вы выдалі акупантам. Таму я і паклікаў вас сказаць – хутчэй знікайце адсюль, каб і следу вашага не было. А то калі не Косця Яроцкі падстрэліць, дык я ўжо напэўна знайду магчымасць выдварыць за межы калгаса. Няма чаго людзей бянтэжыць. У іх і без вас цяпер турботаў хапае.

**Навумчык.** Вось вы як, спадар старшыня! А я думаў, мы прыстойна разыйдземся.

**Паўтарацкі.** Куды ўжо больш прыстойна! Паверце, я тут і вашу карысць маю на ўвазе.

**Навумчык.** Але Яроцкага найперш?

**Паўтарацкі.** Нічога дзіўнага. Яроцкі – мой калгаснік.

**Навумчык.** Дарэчы, пра калгас, спадар старшыня. Якраз у ім уся справа.

**Паўтарацкі.** Як гэта?

**Навумчык.** А так, што я так ці інакш, а павінен быў наведацца да вас. Так што дарэмна міліцыянера турбавалі. І без міліцыянера прыйшоў бы.

**Паўтарацкі.** Ну-ну.

**Навумчык.** Прайшлі чуткі, што вы збіраецеся акцыяніраваць калгас?

**Паўтарацкі.** Самі ж ведаеце – час вымагае. Прыватызацыя.

**Навумчык.** Ну так, прыватызацыя. І былое начальства і цяперашняе пабрала ўжо сабе ўсё лепшае.

**Паўтарацкі.** Ваша праўда, грамадзянін Навумчык. Тут я з вамі згаджуся.

**Навумчык.** Вы ўсё – грамадзянін ды грамадзянін. Быццам і іншага слова нельга падабраць.

**Паўтарацкі.** А што вас гэтак турбуе? Вы ж самі толькі што называлі сябе грамадзянінам суверэннай рэспублікі.

**Навумчык.** Ну так, гэта я сказаў. Але ж...

**Паўтарацкі.** Дык якая ў вас справа ў нашым калгасе?

**Навумчык.** Самі ж ведаеце, і дзед мой і бацька ўступалі тут у калгас. Здавалі і жыўнасць і інвентар, як было загадана. Зямлю таксама аддалі ў калгас. А яно ўсё належыць мне па спадчыне. Так што акцыі таксама належыць атрымаць.

**Паўтарацкі.** Значыць, вы за гэтым і прыехалі да нас?

**Навумчык.** Акурат так.

**Паўтарацкі** *(усё яшчэ ходзіць па пакоі)*. А я думаў... Усё-ткі настальгія па малой радзіме. Аказваецца, не. Прыехалі дзяліць калгас.

**Навумчык.** Прыватызаваць.

**Паўтарацкі.** І якую ж вы частку хочаце атрымаць? Сёння наш калгас – не тое, што ў трыццатым годзе. Многа працы людской укладзена ў яго, поту, ну ўсяго, што маецца на ўвазе пры гэтым.

**Навумчык.** Мне праца людская не патрэбна. Гэта іхняе. А вось зямлю бацькаву, каня, карову належала б вярнуць мне.

**Паўтарацкі.** І вы тады паселецеся ў нас? А як жа Косця Яроцкі? Вы ў разлік не бярэце, яго? Вы ж не думаеце, што ён сапраўды з п'янага ўзбурыўся?

**Навумчык.** Ат, што з хулігана ўзяць? Да таго ж, мне не абавязкова пасяляцца тут. У мяне ўсё ёсць – і кватэра і машына, якую зяць утрымлівае. Так што... Але ж у мяне ёсць дзеці, унукі. Вось ім дзедава спадчына якраз будзе пры новым жыцці, дзякаваць бога. Балазе бальшавікі здаліся. Самі ўзнялі ручкі ў Вярхоўных Саветах.

**Паўтарацкі.** М-да, вы добра прадумалі ўсё, як ехаць да нас, грамадзянін Навумчык. Але ж у нас ўсё, што датычыць спраў калектыўнай гаспадаркі, рашаецца агульным сходам. Хоць мы яшчэ канчаткова і не вырашылі, як нам быць з прыватызацыяй, самі ведаеце, пра яе пакуль што адны размовы паміж людзей, аднак заяву можаце пакінуць. Няхай вырашаюць тыя, хто ўздымаў гаспадарку пасля вайны, што вам належыць і за што. Гэта я таму, каб разыйсціся

нам сёння прыстойна, як вы хочаце. Але паслухайцеся парады – бярыце лахі пад пахі ды ходу адсюль, а то...

*Зноў недзе па вуліцы праходзіць Косця Яроцкі – чуецца песня, у якой некалі партызанскія атрады занімалі гарады...*

**Навумчык** *(усё роўна як ад нечаканасці ўскідвае галаву)*. Во, гэта ж трэба развесці такое хуліганства!

**Паўтарацкі** *(усміхаецца)*. Старая добрая песня. А вы ў нямецкай паліцыі таксама мелі свае песні, грамадзянін Навумчык?

**Навумчык** *(устае з крэсла)*. А як жа! *(Выходзіць)*.

## К А Р Ц І Н А V

*Паўтарацкі сядае ў крэсла, якое вызваліў былы паліцай Навумчык.*

**Паўтарацкі** *(зноў да сваёй скульптурнай выявы)*. Бачыш, Васіль Дзянісавіч, якія цяпер паміж нас, жывых, справы, якія падзеі? Яшчэ ўчора гэты Навумчык сядзеў недзе, гніды прышчаміўшы, і не памышляў аб'яўляцца. А сёння? А сёння ён адкрыта па вуліцы ходзіць, зноў у яго ваяцкі дух грудзі распірае. Маўляў, я супраць Сталіна ваяваў, супраць бальшавікоў, значыць, святую справу рабіў. Бачыш, Васіль Дзянісавіч, да чаго мы дайшлі-даехалі, а ты кажаш!.. Так званыя дэмакраты думаюць, што гэта яны ўсё ў нас зрабілі, але дудкі! Гэта мы. Ты вось, адліты ў бронзе, я вось, жывы, і яшчэ многія, многія... Бо стала жыццё людзям такое, як ёсць, у цяжар. Чаму ў сямнаццатым годзе бальшавікі перамаглі? Ды таму, што памешчыкі з капіталістамі сталі людзям у цяжар. Вось яны і пайшлі супроць іх з бальшавікамі. Можна лічыць, нешта падобнае здарылася і цяпер. Тыя ж бальшавікі, а цяперашнія камуністы таксама сталі людзям у цяжар. Бо дужа доўга і няшчадна панавалі, народ эксплуатавалі. Бачу, ты не зусім згодны са мной? Што ж, я не тэарэтык. Я так, што на відавоку. Але табе, бронзаваму ідалу, лягчэй цяпер. Цяжка мне, вельмі цяжка, жывому. Гэта я яшчэ, як кажуць, храбруся – і акцыянерам стану 4 міліянерам буду. Патрэбны мне гэтыя мільёны! З савецкіх мільянераў ды ў капіталістычныя мільянеры – гэта ўсё роўна што... Таму я і пазіраю часам на гэта трохствольнае ружжо... *(Глядзіць на сцяну)*. Словам, ты сам добра разумееш, Васіль Дзянісавіч. Растрывожыў маю душу гэты былы паліцай, які некалі выдаў немцам Косці Яроцкага дзеда. Тут, у нас, усе ведаюць пра гэта. Аднак бунтуе адзін Косця. Значыць, сапраўды штосьці адбываецца, з чым альбо трэба лічыцца, альбо... Бачыш, сёння лягчэй не дагаворваць нейкія рэчы, але не з-за боязні, канечне; проста, не ведаеш, як што будзе далей, бо жывем мы ў свеце алагічнасцяў, ніякай заканамернасці ні ў развіцці падзей, ні ва ўчынках людзей... А з другога боку – зноў жа пра гэтых паліцаяў. Я іншы раз думаю: лёс у жыцці ўратаваў мяне, што не давялося некалі выбіраць паміж Сталінам і Гітлерам. А некаторым, бачыш,

Васіль Дзянісавіч, давялося. Ну, як гэтаму Навумчыку. А цяпер... Так што, дарагі мой, праўду кажуць людзі: жыццё пражыць – не поле перайсці. Цяпер таксама стала цяжка жыць. Але ж сам бачыш. Сёння госць прыедзе – і твой і мой. Помніш палкоўніка Гарбавіцкага? Дык вось, званіў, казала Валянціна Рыгораўна. Масажыстку вязе. Яна, прызнацца, мне таксама... *(Махае рукой)*. Яшчэ ж і Данута ў самым саку, рукі спрытныя ды ласкавыя. Але... Пазваню-ка ёй, раз адзін застаўся. Нешта хандроз мой... *(Дастае рукой міжплечча)*. Не, не, Васіль Дзянісавіч *(смяецца)*, не таму, што Валянціны Рыгораўны няма. Урэшце, яна даўно ўжо фізіялагічных прэтэнзій да мяне не мае. Цяпер яна, будзем лічыць, ужо ў тваёй нежывой уладзе. Ну а жываму – жывое. І не зайздросць. *(Бярэ са століка, што побач, тэлефон, перабірае кнопкі)*. Алё. Так, гэта я. Разумееш, хандроз мой зноў нагадаў пра цябе. Прыходзь *(кладзе трубку, ставіць тэлефон на столік, уздыхае, але ўжо акурат блажуючы)*. Грахі мае цяжкія!..

## К А Р Ц І Н А  V I

*Заходзіць Данута. Доўга хукае на свае рукі, адаграваe, дарма што прыйшла ў цёплых рукавіцах.*

**Данута.** Дзе ж пані старшыніха?

**Паўтарацкі** *(падыходзіць да жанчыны, памагае распранаць кажушок)*. Яна ж у мяне маці. Паехала да дачкі.

**Данута.** Вы, Васіль Дзянісавіч, так гаворыце, быццам у дакор мне, што я не стала маці!.. Але ж, можа, і па вашай віне. Адных абортаў колькі было!..

**Паўтарацкі.** Чым вінаватых шукаць, лепей бы замуж выходзіла.

**Данута.** Другі раз? Не, Васіль Дзянісавіч, на гэта я не адважуся нават пад прымусам. Хапіла ўжо аднаго замужжа. Што ж датычыць сына ці дачкі.., дык усё роўна будуць лічыць, што вашы, дарма што і замужам за кімсьці стану. Ну ды ладна, звалі?

**Паўтарацкі.** Зваў.

**Данута.** Патрэбна?

**Паўтарацкі.** Патрэбна.

**Данута** *(смяецца)*. Ну то рэнчкі да гуры. *(Праходзіць да закрытай ацяпляльнай батарэі, кладзе на яе рукі)*. Званіў Міхаіл Хведаравіч.

**Паўтарацкі.** Табе?

**Данута.** Так. На масаж напрошваўся.

**Паўтарацкі.** Дык ён жа... масажыстку з сабой вязе!..

**Данута.** Пра гэта маўчаў. Але, мусіць, трэба так разумець: Васілю Дзянісавічу спатрэбілася новая грэлка?

**Паўтарацкі.** Гэта ён па сваёй ініцыятыве.

**Данута.** Зрэшты, усё прыядаецца. Таму я і замуж другі раз не хачу. Але вы не хвалюйцеся. Вось прыедзе Міхаіл Хведаравіч, стану яму цела маладзіць. А вас няхай гладзіць новая. Ну давайце свае плечы, спіну...

**Паўтарацкі.** Проста ў крэсле?

**Данута.** Хочаце? Тады на канапу кладзіцеся.

*Васіль Дзянісавіч раздзяваецца да трусоў, лягае на канапу. Данута таксама скідвае з сябе верхнюю частку адзення, нават ліфчык; пачынае гладзіць рукамі па шыі, плячах, дакранаючыся грудзямі да старшынёвай спіны.*

**Данута.** Тут перастала балець?

**Паўтарацкі.** Так. Але прыемна садніць.

**Данута.** Васіль Дзянісавіч, Васіль Дзянісавіч!.. Не хандроз вас непакоіць. Іншае вам карціць. Я ўжо чую па вашым дыханні, па вашым паху. Ад вас у такіх выпадках пачынае патыхаць, быццам ад кныра.

*Паўтарацкі падхопліваецца, хапае Дануту аберуч, дае на канапу. Але тая супраціўляецца, нарэшце сядае.*

**Данута.** Пачакайце, пачакайце. Я вось нештачкі раскажу вам, Васіль Дзянісавіч. У газеце нядаўна прачытала.

**Паўтарацкі.** Што? Новая парада па сексу? *(Усміхаецца)*.

**Данута.** Амаль што. Але пакуль пра пацалункі.

**Паўтарацкі.** Які ж пацалунак без?.. *(Пачынае каструбаціць жанчыну)*.

**Данута.** Не спяшайцеся, Васіль Дзянісавіч!

**Паўтарацкі.** Дык што там пра пацалункі?

**Данута.** Колькі каштуе жыцця чалавеку кожны пацалунак.

**Паўтарацкі.** Проста пацалунак? Без?..

**Данута.** Так, проста пацалунак.

**Паўтарацкі.** Спадзяюся, рахунак не ў адмоўны бок?

**Данута.** Якраз у адмоўны, Васіль Дзянісавіч. Аказваецца, кожны пацалунак скарачае чалавеку жыццё.

**Паўтарацкі** *(па-ранейшаму ўсміхаючыся)*. На шмат?

**Данута.** Як лічыць, Васіль Дзянісавіч. Але не на хвіліны, не на гадзіны. На тыдні.

**Паўтарацкі.** Дзіўна, але чаму людзі толькі цяпер пра гэта даведаліся? А то б прадоўжылі сабе веку.

**Данута** *(паціскае плячамі)*. Хто ж іх ведае!

**Паўтарацкі.** Вось бачыш, аказваецца, самыя салодкія рэчы скарачаюць чалавеку жыццё. *(Ён таксама сядае, звешвае ногі з канапы)*. Значыць, самае салодкае сёння адмяняецца?

**Данута.** А ўсё-ткі я вас моцна напалохала, Васіль Дзянісавіч...

**Паўтарацкі** *(ласкава)*. Дурніца...

**Данута.** Не, усё-ткі я вас напалохала. Нават не думала, што вы гэткі палахлівы.

**Паўтарацкі.** Ты б яшчэ даўжэй расказвала! Анекдот ёсць пра гэта.

**Данута.** Не, Васіль Дзянісавіч, я вас моцна напалохала.

**Паўтарацкі.** Што ж, лішні тыдзень мне ў маім узросце якраз прыдасца. Сэканомім на пацалунках, здабудзем даўжэйшага веку.

*Звоніць тэлефон.*

**Паўтарацкі.** Здаецца, мінскія госці?..

*Данута кідаецца да сваёй вопраткі. Паўтарацкі ў тым жа выглядзе накіроўваецца да тэлефона.*

**Паўтарацкі** *(у тэлефонную трубку)*. Так, я. *(Слухае)*. А-а, гэта вось хто! Рады чуць, Андрэй Сцяпанавіч. *(Слухае)*. Тым больш – бачыць, раз ты ўжо тут, у нас. Ну, з абласнога цэнтра сюды рукой падаць. І дарога добрая. Заносаў жа не было. Так што чакаю. *(Слухае)*. Нічога. Нічога. Сёння ў мяне гасцінны дзень. З Мінску Гарбавіцкі таксама абяцаўся к абеду. Я ўжо думаў – гэта ён. Але добра, давай хутчэй. Чакаю. *(Кладзе трубку, да Дануты)*. Госці, але не тыя. Не мінскія. Знаёмы старшыня калектыўнай гаспадаркі. Цяпер гэтак калгасы на тэлебачанні завуць. Дык вось знаёмы старшыня ў госці едзе. Дарэчы, ты яго ведаеш. Шарэйша. Помніш, у Міхаіла Хведаравіча ў Мінску неяк разам гасцявалі?

*Данута нарэшце надзяваецца, кпліва ўсміхаючыся, ідзе ў калідор, дзе вісіць яе кажушок.*

**Паўтарацкі.** Куды ты?

**Данута.** У вас жа госць будзе.

**Паўтарацкі.** Ну і што? Цябе ж ён ведае!

**Данута.** Не, Васіль Дзянісавіч, з Шарэйшам вы ўжо неяк адзін. Іншая справа – Міхаіл Хведаравіч. Ен мне таксама званіў, масаж зноў спатрэбіўся. Бывайце, Васіль Дзянісавіч.

**Паўтарацкі.** Пачакай, пачакай, Данута. Чаму ты раптам гаворыш – зноў? Ты што, мела і з ім справу?

**Данута.** Так. Пасля таго, як мы з вамі, Васіль Дзянісавіч, пераначавалі ў ягонай кватэры. Тады ён і сказаў: не стану з ім любіцца-кахацца – аддасць запісы нашых з вамі начных оргій у КаДэБэ. Ну я і спалохалася за вас.

**Паўтарацкі.** Чаму мне не сказала?

**Данута.** Гэта вы так сёння настроены, а тады палкоўнік КаДэБэ ўсіх трымаў у руках. Дырэчы, ён мяне якраз і папярэдзіў, каб я нікому ні гу-гу.

**Паўтарацкі.** Ну і сцерва ты!

**Данута.** А можа, не я? Можа вашы госці? Хто з ЦэКа, хто з КаДэБэ. Яны ж змушалі і гвалцілі.

**Паўтарацкі.** Згінь ты!..

*Данута выходзіць.*

## КАРЦІНА VII

*Гаспадар зноў сам-насам. Праўда, ужо надзеты. Падыходзіць да ружжа, здымае яго са сцяны, круціць-верціць, тады прыцэльваецца, імітуе стрэл: «пуф- паф», нарэшце ўладкоўваецца ў крэсла насупраць сваёй скульптурнай выявы.*

**Паўтарацкі** *(да бюста)*. Спадзяюся, хоць ты не падумаў, што я спалохаўся пацалункаў? Ну і на тым, як кажуць, дзякуй. На жаль, усё гэта, здаецца, ужо ў мінулым. Не ў маім жыцці, а ў тваім, якое, мусіць, застыла ў адным і тым жа жаданні, у адной і той жа магчымасці. Скажу шчыра, мне б цяпер не Дануціны пацалункі лічыць, а як таму ўсходняму шаху самых маладзенькіх дзевак па баках у ложку трымаць, каб не сваю жывую энергію траціць, а ад іх набірацца. Кажуць, вельмі ўплывае гэта і на патэнцыю і на працягласць жыцця. Так што, Данута, лічы, сёння мяне выратавала, пачаўшы расказваць пра шкоднасць пацалункаў. Але ж... гэты палкоўнік!.. Вось табе і сябра!.. Цьфу!.. Ты, Васіль Дзянісавіч, таксама не чакаў, што Гарбавіцкі стане займацца палавым шантажом? Маўчыш? А я, бачыш, болып даверлівы. Шкада, што ты не маеш магчымасці гаварыць, а то ўжо, няйначай, па цяперашнім уседазвольным часе нарасказваў бы мне такога, ад чаго ў жахлівае ўтрапенне прыйдзеш. Ва ўсякім разе, ад цябе я пачуў бы цяпер пэўна пра ўсё тое, пра што сам мог некалі здагадацца ды сказаць, але не сказаў. Прызнаюся, не здолеў. Герой, а вось жа!.. Дык кажаш, не надта забаўляцца з ружжом?

## КАРЦІНА VIII

*У пакой заходзяць Паўтарацкі і Андрэй Сцяпанавіч Шарэйша. Госць у зімовым, гаспадар у тым жа, у чым яго толькі што бачылі: Васіль Дзянісавіч хадзіў на вуліцу сустракаць госця. Паўтарацкі колькі часу чакае, пакуль Шарэйша распранецца, тады пачынае звычайную ў такім выпадку гаворку.*

**Паўтарацкі.** Як даехаў?
**Шарэйша.** Дарога чыстая, роўная, як для яечка.
**Паўтарацкі.** Мы тут стараемся.
**Шарэйша.** Добрая дарога, Васіль Дзянісавіч, гэта ўсё роўна што...
**Паўтарацкі** *(не дае дагаварыць госцю)*.

*Гэта ўсё роўна, што добрая чарка.*

**Шарэйша** *(пацірае рукі)*. Слушна, слушна! Хоць, праўда, сам я хацеў сказаць іншае. Звязаць з эканомікай. Ну так, дарагі, эканоміка... Штосьці накшталт...
**Паўтарацкі** *(зноў перабівае госця)*.

*Але тым не менш я стаю на сваім прыярытэце. Калі сядзем за стол? З дарогі паложана.*

**Шарэйша.** Паложана, павалена... *(Глядзіць на скульптурную выяву гаспадара)*. Добра зроблена. Хто ляпіў?

**Паўтарацкі.** Іван Паско.

**Шарэйша.** А-а, гэта той, што на героях практыкуецца, на касманаўтах?

**Паўтарацкі.** Партрэтыст што трэба. Не прасіць жа было старога Азгура. Нябось, ужо рукі дрыжаць?

**Шарэйша.** Мяне гэта, як кажуць, абыходзіць. Ужо адзін раз быў падмануты. Цяпер – тым больш. Таму я і не цікаўлюся, хто лепшы скульптар, хто – горшы.

**Паўтарацкі.** Але чаму не пытаешся, чаму ў кватэры трымаю? *(Ківае на скульптурную выяву)*.

**Шарэйша** *(смяецца)*. Дык мароз жа на дварэ! Сцюжа!

**Паўтарацкі** *(таксама смяецца)*. Добра сказана – мароз на дварэ! Амаль гэтак жа я толькі што адказаў аднаму быламу паліцаю.

**Шарэйша.** Праблема з паліцаямі?

**Паўтарацкі** *(пацiскае плячамі, няпэўна)*. Ну так... Прывалокся аднекуль... Патрабуе бацькаву зямлю, якую той у калгас некалі аддаў. Дык ён цяпер хоча перадаць яе ва ўласнасць унукам.

**Шарэйша.** А кажаш – праблем няма.

**Паўтарацкі.** У нас праблема не ў гэтым. Вельмі проста ён хоча вырашыць свой інтэрас. Ды і дзе гэта відана, каб?.. Словам, такім чынам пытанне яшчэ не ставіцца ўвогуле. Гэта – прыватная ініцыятыва. Падумалася чалавеку, што можна вярнуць бацькаву зямлю.

**Шарэйша.** А чаму б яму і не падумаць? Столькі размоў – прыватызацыя, фермерства, арэнда...

**Паўтарацкі** *(усё роўна як не слухае)*.

*Ну то сюды заказаць абед? Ці, можа, у рэстаран сходзім? Пaглядзіш, які ён у нас. Нядрэнна гучыць – у калгасе рэстаран, га?*

**Шарэйша.** Нядрэнна, нядрэнна. Але не спяшайся.

**Паўтарацкі.** Я гэта к таму, што Валянціны Рыгораўны няма. Паехала ў Мінск, да дачкі. Ну а калі не спяшацца, як ты кажаш, то мне таксама гэта дарэчы. Помніш палкоўніка Гарбавіцкага?

**Шарэйша.** Чаму ж не?

**Паўтарацкі.** Абяцаў пад’ехаць сёння. Бадай, ужо вось-вось недзе.

**Шарэйша.** Вось і цудоўна. Ён яшчэ служыць?

**Паўтарацкі.** На пенсіі. Хоць наўрад ці кадэбоўцы... Словам... Няйначай, яны на службе там заўсёды. Яўна ці тайна.

**Шарэйша.** Ты так думаеш?

**Паўтарацкі** *(паціскае плячамі)*. Гэта ж як пасля дурдома – вылечыўся ці не вылечыўся, а вечна будзеш лічыцца за ім.

**Шарэйша.** Хіба што.

**Паўтарацкі.** Але пенсія ўсё-ткі ў яго невялікая. Можна сказаць, пабіраецца. Я таксама сёе-тое падкідваю яму. То пляшку гарэлкі, то штаны модныя.

**Шарэйша.** Няўжо не меў зберажэнняў?

**Паўтарацкі.** Якія цяпер зберажэнні? Усё ж ляснула па ўкладах пасля павышэння цэн. А ён да таго ж накупляў на свае грошы аблігацый. А тыя замарожаны. Вось і даводзіцца, можна сказаць, пабірацца. Але так яму і трэба!

**Шарэйша.** Чаму раптам?

**Паўтарацкі.** Ёсць за што. Тут перад табой адкрылася адна акалічнасць.

*Зноў на вуліцы чуецца песня пра партызанаў, якія некалі занімалі гарады...*

**Шарэйша.** Хто гэта?

**Паўтарацкі.** Ды так. Тутэйшы. За паліцаем палюе. Кажа, падаецца ў партызаны.

**Шарэйша** *(смяецца)*. Не больш не менш?

**Паўтарацкі.** Гэты паліцай некалі выдаў немцам ягонага дзеда.

# ДЗЕЯ ДРУГАЯ

## К А Р Ц І Н А  І Х

*У кватэру, дзе застаюцца Паўтарацкі з Шарэйшам, ледзь не ўвальваецца Косця Яроцкі з ружжом за спіной.*

**Яроцкі.** Дзе ён?

**Паўтарацкі.** Хто?

**Яроцкі.** Ну паліцай! Казалі ж, што міліцыянер да вас, Дзянісавіч, павёў яго.

**Паўтарацкі.** Міліцыянер прывёў, а я адпусціў.

**Яроцкі.** Навошта? Я тут бы яго і!..

**Паўтарацкі.** Ну але. Ты б яго, а міліцыянер бы цябе.

**Яроцкі.** Як гэта?

**Паўтарацкі.** А так! Па закону. За нападзенне на грамадзяніна. Я не думаю, што за забойства?

**Яроцкі.** А што?

**Паўтарацкі.** А тое, што я табе загадваў праспацца! А ты ўсё яшчэ блазнуеш і вёску трывожыш!

**Яроцкі.** Тады навошта Навумчык тут бадзяецца?

**Паўтарацкі.** У яго справа ёсць. Ён... Урэшце, што я табе павінен даводзіць? Ідзі-тка ты і праўда добра праспіся. Надакучыў!

**Яроцкі.** Не, так справа не пойдзе, Дзянісавіч.

**Паўтарацкі.** А як жа?

**Яроцкі.** Пайду ў партызаны.

**Паўтарацкі.** Ідзі, ідзі. Толькі не замінай. Бачыш *(паказвае на Шарэйшу)*, чалавек у мяне.

*Але Косця Яроцкі не спяшаецца слухацца. Паварочваецца да скульптурнай выявы Паўтарацкага.*

**Яроцкі.** Бачыш, Дзянісавіч, як яны цяпер разважаюць? Гэтыя бацькі-камандзіры? Ім што былы паліцай, што савецкі чалавек – аднолькава. Усе зрабіліся законнікамі. Аказваецца, усе змагаліся супраць сталіншчыны, супраць таталітарызму. А таго не разумеюць, што гэта ад палахлівасці. Ты б сказаў яму *(паказвае на жывога Паўтарацкага)* пра гэта, калі мяне не хоча слухаць. *(Жывому Паўтарацкаму)*. Эх вы, Васіль Дзянісавіч, а яшчэ герой! Ды мы вас ад каго хочаце абаронім! Няхай толькі паспрабуюць!

*Косця Яроцкі з крыўдай выходзіць.*

**Паўтарацкі.** Бачыш, што адбываецца, Андрэй Сцяпанавіч?

**Шарэйша.** Вайна, Васіль Дзянісавіч, вайна працягваецца. Былыя паліцаі пачынаюць адкрыта змагацца з былымі партызанамі.

**Паўтарацкі.** Толькі гэтага цяпер не хапала!

**Шарэйша.** Але паслухай, што і я табе раскажу, Васіль Дзянісавіч. У сорак трэцім у нас жывымі былі спалены людзі ў трох вёсках. Хто ў царкве, хто ў свіране... Але па адной камандзе, якой стаў царкоўны звон. У нас цяпер на ўсіх тых месцах помнікі стаяць.

**Паўтарацкі.** Пазванілі... і ў полымя?

**Шарэйша.** Але я не пра гэта. Дакладней, не толькі пра гэта. Палілі людзей па загадзе аднаго маёра, з нашых, за граніцай ён пасля вайны генералам стаў. Жонка яго таксама з нямецкіх прыхільнікаў. Урэшце, гэта гісторыя вядома. Дык вось нядаўна прыязджае да мяне адзін наш міністр, аказваецца, едзе ў Штаты. І просіць раптам – ці нельга той кабеце адвезці што-небудзь ў падарунак з радзімы мужавай?

**Паўтарацкі.** Ну а ты?

**Шарэйша.** А што я? Я, як і ты свайму паліцаю. Давайце, кажу, вынясем гэтае пытанне з падарункам на агульны сход калгаснікаў.

**Паўтарацкі.** Ну а што міністр?

**Шарэйша.** Ці ён жа дурны?

**Паўтарацкі.** Тады навошта сярод нас дурняў шукае?

**Шарэйша.** Цяпер гэта модна. Так што сёння ва ўсіх галінах жыцця адбываюцца цікавыя і складаныя працэсы, Васіль Дзянісавіч. Між тым, я прыехаў да цябе...

**Паўтарацкі.** Зразумела, не пра адных жа паліцаяў размовы весці. Але ўсё-ткі мне хацелася б ведаць адну рэч – кім сталі дзеці, унукі, пляменнікі гэтага Навумчыка? Няйначай, з дапамогай савецкай улады, з якой ён змагаўся, ужо недзе дэлегатамі сталі, дэпутатамі, рознымі членамі і па-зачленамі... І няйначай жа, што цяпер таксама лічаць сябе змагарамі супраць гэтай улады. Між тым, ці не паклапаціцца нам сапраўды пра абед? Калі яшчэ тыя госці?

*Васіль Дзянісавіч звоніць па тэлефоне. З кімсьці цамаўляецца пра абед.*

**Паўтарацкі** *(кладзе трубку, да госця)*. А што табе, Андрэй Сцяпанавіч, гэтак моцна заруліла?

**Шарэйша.** Пагаварыць пра жыццё. Як яго ладзіць далей?

**Паўтарацкі.** Хто ж гэта цяпер ведае? Праўда, ты доктар навук. Здавалася б, табе і карты ў рукі. Але ж гэта гадоў колькі назад можна было слухаць дактароў-эканамістаў. Цяпер і на іх плююцца.

**Шарэйша** (усміхаецца). Бо эканамічныя і палітычныя прагнозы не даюцца сёння. Усё адны абяцанкі-цацанкі. А дурням радасць...

**Паўтарацкі** *(задаволена)*. Твая праўда. Але ж на гэта прычыны ёсць. Да ўлады дапалі павярхоўныя людзі. І ў Вярхоўным Савеце і ва ўрадзе. Тым часам на Грамадзянскай плошчы прыкметна дзейнічаюць толькі дзве сілы – былыя і новыя камуністы і так званыя дэмакраты.

**Шарэйша.** Дэрмакраты. Здаецца, так іх пачынаюць называць?

**Паўтарацкі.** Дзіўна, але яшчэ год назад здавалася...

*Нехта стукаецца ў дзверы. Заходзіць афіцыянтка з калгаснага рэстарана з дзвюма вялікімі торбамі ў руках.*

**Паўтарацкі** *(да яе)*. Гэта ты, Сонечка? Добра, наладжвай нам стол. Вось у тым кутку. *(Паказвае)*. Так, рассоўны, ты ж ведаеш, як гэта робіцца.

*Дзяўчына пачынае завіхацца каля стала.*

**Паўтарацкі.** Дэрмакраты-то дэрмакраты! На мянушкі ў нас здатныя. Але ўсё-ткі яны моцна прагнуць улады. Значыць, не так сабе?

**Шарэйша.** Зразумела, што не так сабе. Але ж патрэбна і трэцяя сіла.

**Паўтарацкі.** Нешта цяпер даволі актыўна бяруцца за гэтае слова – трэцяе са- слоў’е, трэцяя сіла... Цікава, а як ты ўяўляеш яе сабе?

**Шарэйша.** Трэба ствараць новую партыю.

**Паўтарацкі.** Дык іх жа цяпер, партый, як на гайні выжлаў.

**Шарэйша.** Гэта тых, што з боку-прыпёку. А сапраўдных якраз і няма. Вось з гэтым я і прыехаў да цябе, Васіль Дзянісавіч.

**Паўтарацкі.** І якую ж ты партыю маеш намер стварыць, Андрэй Сцяпанавіч?

**Шарэйша.** Ну назвы яшчэ пэўнай у нас няма. Але змест ёсць – аграрна-прамысловая.

**Паўтарацкі** *(задумваецца)*. Зразумела, Андрэй Сцяпанавіч, зразумела. Таму і я спатрэбіўся?

**Шарэйша.** Так.

**Паўтарацкі.** Не, Андрэй Сцяпанавіч, не. Я застануся ў гэтай партыі, у нашай з табой, якая прыпынена. Вярхоўным Саветам. Самімі ж камуністамі, якія прабраліся туды пад сцягам партыі. Слабакамі мы... аказаліся. Не, нашы з табой таварышы цяпер на гарматы па кранштацкім лёдзе не пойдуць.

**Шарэйша.** Ты не зусім так зразумеў мяне, Васіль Дзянісавіч.

**Паўтарацкі.** А што тут разумець? Ты стварай новую партыю, а я застануся ў старой, няхай што і ўшчэнт знявечанай. Дарэчы, ты размаўляў пра гэта з цяперашнімі камуністамі?

**Шарэйша.** Размаўляў. І даволі доўга.

**Паўтарацкі.** Ну і што?

**Шарэйша.** А тое, што нічаму яны не навучыліся. Здцыкліліся на старых догмах, точаць невядома на каго нажы, як цецерукі на таку. Не, адзіная сіла цяпер – гэта рабочыя і сяляне.

**Паўтарацкі.** Дык і раней жа гэтак гаварылі.

**Шарэйша.** Ну раней толькі гаварылі, цяпер будзе наадварот. Рабочыя і сяляне сапраўды будуць набываць сілу.

**Паўтарацкі.** Дай Бог нашаму цяляці...

*Дзяўчына тым часам скончыла стаўляць на стол закусь, выняла з торбы дзве бутэлькі каньяку. Паклікала: «Васіль Дзянісавіч!»*

**Паўтарацкі.** А-а, Сонечка! *(Да госця)*. Ну то пойдзем? Далучымся да рэвалюцыі?

**Шарэйша.** Чаму да рэвалюцыі?

**Паўтарацкі.** Прычапілася неяк гэта. Вось я і паўтараю часам. *(Да дзяўчыны)*. Ты, Сонечка, можаш... Але не, лепей я зноў пазваню, а ты прыйдзеш, забярэш усё гэта, калі, вядома, што застанецца. *(Падштурхвае госця)*. Хадзем, хадзем, Андрэй Сцяпанавіч. А то мы за палітыкай маглі прапусціць калі не самае галоўнае, то вельмі істотнае.

**Шарэйша** *(смяецца, але найбольш з далікатнасці)*. Не кажы, Васіль Дзянісавіч.

*Дзяўчына выходзіць. Паўтарацкі глядзіць услед.*

**Паўтарацкі.** Неспакушае, Андрэй Сцяпанавіч? А то...

**Шарэйша.** Мне даўно казалі, што ў цябе тут, як некалі ў панскай сядзібе. Можа, і права першай ночы скарыстоўваецца?

**Паўтарацкі.** Не кажы глупства!.. Але калі ёсць патрэба, можам дапамагчы.

**Шарэйша** *(смяецца, круціць галавой)*. Не, даражэнькі, не! Я сам выбіраць умею, яшчэ ж не зломак. Ты мне лепей з партыяй дапамажы.

**Паўтарацкі.** Ды і я не зломак, як ты кажаш. Але ж, на жаль, нашы жонкі раней за нас старэюць.

*Сядаюць за стол. Гаспадар налівае каньяк у чаркі, мінеральную ваду ў шклянкі. Кажа: «Рады, «што прыехаў». Выпіваюць, закусваюць і нейкі час маўчаць. Нарэшце...*

**Паўтарацкі.** А чаму гэткая паспешлівасць з партыяй?

**Шарэйша.** Дык рэферэндум жа на парадку дня. Значыць, новыя выбары. А мы хочам дэмакратычным шляхам да ўлады прыйсці як вылучэнцы рабочых і сялян аграпрамысловага комплексу. Ты ўсё-ткі падумай, Васіль Дзянісавіч.

**Паўтарацкі.** Падумаю. *(Зноў налівае чаркі)*. Але скажы, што ты з калгасам збіраешся рабіць? Усё-ткі прыватызацыя прымусіць нас нешта рабіць.

**Шарэйша.** У нас ужо ўсё вырашана. Здаем гаспадарку ў арэнду фермерам. А ты?

**Паўтарацкі.** Але ці не застанешся ты са сваёй арэндай сам без штаноў?

**Шарэйша.** Усё можа быць. Але калі ваўка баяцца, то ў лес няварта хадзіць. Ды я чамусьці ніколі і не марыў у жыцці багатым быць. Так што...

**Паўтарацкі.** А я вось хачу. Таму і думаю акцыяніраваць калгас.

**Шарэйша.** Ну з калгасам давядзецца штосьці рабіць – тут хочаш не хочаш, а мусіш. А вось наконт багацтва... Нешта я не веру тут. Я разумею, калі чалавек імкнецца з беднасці ў багацце. А тут... Не, Васіль Дзянісавіч, як быццам блазнуеш.

**Паўтарацкі.** Нешта мне гавораць апошні час – блазнуеш, блазнуеш... А я і не думаю. Гэта ж – ад збянтэжанасці. Няўжо не зразумела хоць табе? Ад збянтэжанасці, ну ад непадрыхтаванасці да новага жыцця, скажам. Усе хапаюць, што толькі ўбачаць, што пад рукамі апынецца, таму і сам пачынаеш торгацца.

*Звоніць тэлефон.*

**Паўтарацкі** *(з палёгкай)*. Здаецца, нарэшце мінскія госці.

**Шарэйша.** О, тады мне час ехаць!

**Паўтарацкі.** Ці варта спяшацца? Тым больш, што прыязджае наш знаёмы.

**Шарэйша** *(усхопліваецца з-за стала)*. Справы, справы!.. Мне яшчэ трэба сёння заехаць да аднаго паважанага чалавека.

**Паўтарацкі** *(беручы трубку тэлефона, Шарэйшу)*. Ты нечым нагадваеш мне цяпер, Андрэй Сцяпанавіч, гогалеўскага Чычыкава. Шукаеш мёртвыя душы?

**Шарэйша.** Ну да мёртвых яшчэ нам далёка. Хапае жывых.

**Паўтарацкі** *(у трубку)*. Алё, алё. А-а, гэта ты, Павел Ягоравіч. *(Слухае)*. А я думаў, госці з Мінску. Ну то добра. Не, не. Толькі не зараз. У мяне сёння спрэс

госці. Дзень адведак. Так, так. *(Кладзе трубку, да Шарэйшы)*. Дык я кажу, Андрэй Сцяпанавіч, навошта спяшацца?

**Шарэйша.** Не, мне якраз пара.

## КАРЦІНА X

*Шарэйша ідзе ў калідор апранацца. Гаспадар за ім. Тады вяртаецца, падыходзіць да сваёй скульптурнай выявы.*

**Паўтарацкі.** Бачыш, Васіль Дзянісавіч, якімі мы людзьмі сталі? Усе выбіты з каляіны. Андрэй Сцяпанавіч лётае, як некалі Чычыкаў, з раёна ў раён, спрабуе ўтрымаць на паверхні жыццё, як той човен. Я блазную. Хачу ўкруціць сябе ў новыя гаспадарчыя структуры, налева і направа хлушу, што хачу стаць мільянерам. А чаго мне дагэтуль не хапае? Скажы! Ага, маўчыш! Але я тым не менш зайздрошчу табе. Табе ўжо не трэба мяняцца ды падыгрываць абы каму. Ты мая мяжа, ты маё сумленне, Васіль Дзянісавіч. Ды чорт з імі з усімі! Даўно я не стаяў на галаве. Можа, пасля гэтага розуму дадасца.

*Апіраючыся на рукі, Паўтарацкі становіцца перад скульптурай дагары нагамі і доўга трымаецца так.*

## КАРЦІНА XI

*Нарэшце прыязджаюць да Паутарацкага мінскія госці, а ён усё яшчэ стаіць, можна сказаць, на галаве. У пакой заходзяць палкоўнік у адстаўцы Гарбавіцкі, доктар Стружка і маладая дзяўчына Ліна. Усе, акрамя Гарбавіцкага, здзіўлены, як стаіць Васіль Дзянісавіч. Першая прыходзіць у сябе Ліна.*

**Ліна** *(да Міхаіла Хведаравіча)*. Дык вось гэта, гаспадары, Міхаіл Хведаравіч?

**Гарбавіцкі.** Так, Ліначка, так.

**Ліна.** Колькі ж іх тут?

**Гарбавіцкі.** Ды вось лічы.

**Ліна** *(адразу паказвае на бюст)*. Адзін. Гэта можна прызнаць за чалавека, дарма што з гліны.

**Гарбавіцкі.** Нез гліны, Ліначка, а ў бронзе. Васіль Дзянісавіч Паўтарацкі ўвасоблены ў бронзе.

**Ліна.** А гэты? Што гэта за фігура такая? *(Паказвае на жывога Паўтарацкага)*.

**Гарбавіцкі.** Сама ж бачыш.

**Ліна.** І колькі ён будзе стаяць так?

**Гарбавіцкі.** Бывае, стаіць падоўгу. Я не адзін раз назіраў за гэтым. Але цяпер... Госці ж у яго. Ды і ты вось такая маладая ў нас. Дык якая карысць яму стаяць дагары нагамі? Не тая поза.

*Невядома, што прыходзіць доктару Стружку ў галаву пры гэтай размове, але ён раптам пачынае рагатаць. Васіль Дзянісавіч перакручваецца ў паветры, тупка становіцца на ногі.*

**Гарбавіцкі.** Ты, бачу, не пакідаеш прывычку сваю пастаяць на галаве?

**Паўтарацкі.** Прыемна, ведаеш, бачыць перад сабой перавернутых людзей.

**Стружка.** Ну цяпер гэта няхітрая справа, Васіль Дзянісавіч. Цяпер у нас, можна лічыць, усе і ўсё перавернута.

**Гарбавіцкі** *(зноў бярэ на сябе размову).* Дарэчы, Васіль Дзянісавіч, знаёмцеся. Доктар Стружка.

**Стружка.** Вельмі прыемна.

**Гарбавіцкі.** А гэта – наша Ліначка.

**Паўтарацкі.** Навошта ж адразу... і доктар і масажыстка? Яна што – пры ім заўсёды? Выязная?

**Гарбавіцкі.** Доктар – спецыяліст па барадаўках.

**Паўтарацкі.** Адзін такі вось ужо ганяўся за маёй папіломай. Але я, дзякаваць Богу, уратаваўся.

**Ліна.** Як жа вам гэта ўдалося, Васіль Дзянісавіч?

**Паўтарацкі.** А я таго доктара паступова спаіў, як гасцінны гаспадар.

**Ліна.** Ну-у, Васіль Дзянісавіч! Аказваецца, вы небяспечны чалавек?

**Паўтарацкі.** Калі даводзіцца ратавацца, мілая дамачка, то... *(Глядзіць на доктара Стружку).* Цікава б даведацца, што ў ягонай барадзе хаваецца? Якая пагроза?

**Гарбавіцкі.** Для цябе, Васіль Дзянісавіч, бадай, аніякай. Ну пазбавішся нарэшце папіломы сваёй і колаў для «Масквіча».

**Паўтарацкі.** Гэта плата за барадаўку?

**Стружка.** Калі будзе на тое вашая ласка...

**Паўтарацкі.** Якая тут ласка? Вашы грошы – мае колы. Здаецца, яшчэ адны ёсць у гаражы.

**Гарбавіцкі.** Добра, добра, пра плату мы пасля змовімся. Дзе ж твая Валянціна Рыгораўна?

**Паўтарацкі.** Маглі сустрэць па дарозе.

**Гарбавіцкі.** Яе не сустрэлі. Але ці не Шарэйша гэта адсюль выскачыў?

**Паўтарацкі.** Так.

**Гарбавіцкі.** Што яму патрэбна было ў цябе?

**Паўтарацкі.** Ты пытаешся, як у старыя свае часы. Ну прыязджаў.

**Гарбавіцкі.** Я гэта к таму, што шчаслівы той чалавек, у якога і сяброў шмат і гасцей многа.

**Паўтарацкі.** А-а, ты вунь пра што? А я вось нядаўна прачытаў у адной кніжцы, што гэта не так, Міхаіл Хведаравіч. Аказваецца, сапраўдным чалавекам становішся тады, калі набываеш ворагаў.

**Гарбавіцкі.** Ну не без таго, Васіль Дзянісавіч.

**Паўтарацкі.** А ты, таварыш палкоўнік, друг мне ці вораг?

**Гарбавіцкі.** Ну што ты, Васіль Дзянісавіч! Ад каго ад каго, ад цябе ўжо ніяк не чакаў!

**Паўтарацкі.** Мы з тваёй здрадай, Міхаіл Хведаравіч, яшчэ разбярэмся. Давай-тка ўладкуем спярша гасцей. *(Бярэ трубку тэлефона).* Алё, гасцініца? Мар'я Іванаўна, тут да мяне госці прыехалі. Ён і яна. Дарэчы, сталічныя дактары. Вось толькі я не ведаю, ці ёсць у вас папілома. *(Паварочваецца да гасцей, смяецца).* Кабета, бачыце, не ведае, што такое папілома. *(Пытаецца ў доктара Стружкі з Лінай).* Як вам? Адзін нумар на дваіх прасіць ці паасобку будзеце жыць?

**Гарбавіцкі** *(адказвае за ўсіх)*. Паасобку, паасобку!

**Паўтарацкі.** Дык вось, Мар'я Іванаўна, кажуць – паасобку. І Міхаілу Хведаравічу нумарок падбяры. Так, так, і ён прыехаў. Ну дык... падумай, усё-ткі, Мар'я Іванаўна, пра сваю папілому. Урэшце, доктар дапаможа адшукаць, дзе яна, у якім месцы. Не можа быць, каб у жанчыны ды не было папіломы. *(Кладзе трубку, да гасцей).* Ну вось, як кажуць, азадачылі кабету. Так што старайцеся, доктар. Мы вам бародавак тут шмат пазнаходзім. І работы хопіць і хабару таксама. Ну, Міхаіл Хведаравіч, госці няхай размяшчаюцца ў гасцініцы. Там і абедаць будзем. А ты пачакай пакуль тут.

*Доктар Стружка і масажыстка Ліна выходаяць.*

## КАРЦІНА XII

*На сцэне – Паутарацкі і Гарбавіцкі.*

**Гарбавіцкі.** Пра якую ты здраду маю перад табой згадваў тут?

**Паўтарацкі.** А вось пра якую! *(Размахваецца і б'е што ёсць моцы Гарбавіцкага па скроні).*

*Гарбавіцкі хапаецца правай рукой за балючае месца, амаль з жахам таропіць вочы на гаспадара.*

Гэта табе за Дануту, якую ты шантажыраваў, выкарыстаўшы свой кадэбоўскі метад. І не пярэч і не апраўдвайся. Яна мне пра ўсё расказала сёння. *(Паказвае на скульптурную выяву).* Вось за яго. Абразу нанёс ты яму. Гэта ён твой друг-таварыш. І ніколі, на жаль, ужо не адпомсціць. Бо страціў такую магчымасць. Што ж датычыць мяне... Настаў час расчараванняў. Усе мы, Міхаіл Хведаравіч, у вялікім дзярме апынуліся. І па вашай таксама, палкоўнік, віне. Ты

маўчы, маўчы. Я тут прывык размаўляць адзін. Толькі Васіль Дзянісавіч *(ківае на скульптурную выяву)* чуе. А цяпер вось і ты. Дык пра вялікае дзярмо, у якім мы ўсе апынуліся і па віне дзяржаўнай бяспекі. І, можа, найперш, як кажуць, куды глядзелі? Цяпер увесь час адчуваеш, што ідзеш па чымсьці брыдкім. Але ты не бойся. Старых прыяцеляў кідаць мне позна ўжо, а новых... Дык чаму сярод новых такое вось здрадлівае гаўно, як ты, не сустрэнецца? Так што па-ранейшаму прыязджай да мяне, мой даўні камсамольскі прыяцель, з якім мы нямала перабралі некалі дзевак. Але за Дануту не дарую.

**Гарбавіцкі.** Пры чым тут Данута? Я табе вось прывёз зусім маладую.

**Паўтарацкі.** Няйначай, новую кошку, якая ўлезе з кіпцюрамі ў душу?

**Гарбавіцкі.** Асоба праверaная.

**Паўтарацкі.** Кім?

**Гарбавіцкі.** Доктар гарантуе. Гэта яго кадра.

**Паўтарацкі.** І ён не шкадуе адцаць мне?

**Гарбавіцкі.** За колы для «Масквіча» ён што хочаш адцасць. Ды яшчэ калі па зусім нядаўняй цане.

**Паўтарацкі.** Як гэта?

**Гарбавіцкі.** Ну па семсот за адно кола. Я яму абяцаў. Бо прыехалі на яго «Масквічы».

**Паўтарацкі.** Дзіўна ў нас выходзіць. Табе дай штаны, дружбаку твайму колы. Цікава, што запатрабуе яна? Але няхай. Дык за Дануту табе аднае поўхі хопіць? А то глядзі, я на расправу скоры. Вунь і вінтоўка вісіць. *(Паказвае на сцяну).* Тым больш што ў апошні час я нярэдка бяру яе ў рукі. Гэта, кажуць, нядобра, бо куля тады абавязкова вылятае са ствала, хочаш – не хочаш. А, Васіль Дзянісавіч *(да сваёй скульптурнай выявы)*, пакінем яго жывога? А ў сваім сяброўстве? Маўчыш? Так брыдка і табе і мне за нашага даўняга сябра. Але ты пачакай, вось зараз мы сходзім у рэстаран на абед, тады яшчэ пагаворым. Хадзем, Міхаіл Хведаравіч, пакуль мы з Васілём Дзянісавічам не перадумалі ды ўсё яшчэ гасцінныя.

*Паутарацкі і Гарбавіцкі выходзяць.*

## К А Р Ц І Н А  X I I I

*Заходзіць Косця Яроцкі. Азіраецца, але не бачыць у пакоі гаспадара. Падыходзіць да сцяны, дзе вісіць вінтоўка. Здымае яе. Круціць у руках, клацае затворам. Тады здымае сваё ружжо з правага пляча, вешае на тое месца, дзе была вінтоўка Паўтарацкага. Паварочваецца ісці з вінтоўкай, аіе тут жа перадумвае, вяртаецца назад, бярэ сваё ружжо, а вінтоўку вешае.*

**Яроцкі** *(падыходзіць да скульптурнай выявы старшыні)*. Ну скажы хоць ты, Васіль Дзянісавіч! Сярод жывых не знайсці ніякай рады. Усе ледзь не смяюцца з мяне, што я хаджу па вёсцы з гэтай дубальтоўкай ды пагражаю пайсці

ў партызаны, каб паквітацца з сапраўдным забойцам майго дзеда. Усе наракаюць на вайну ды на немцаў. Быццам бы немцы маглі нарабіць тут столькі шкоды без нашых? Што маўчыш? Ты ж не абцяжараны цяперашнімі чалавечымі хітрыкамі? Нават бояззю? Эх, людзі! Вы думаеце, мне толькі і забавы тое, што палохаць нейкага паліцая? Але адпомсціць забойцу – святая справа. І на дзедавай магіле напісаць чорнымі літарамі: «Мяне, моў, забіў наш паліцэйскі Навумчык». Не выдаў, а якраз забіў.

*Махае рукой, выходзіць.*

ІВАН
ЧЫГРЫНАЎ.
ВЕРНАСЦЬ
ПРАЎДЗЕ

ВІРТУАЛЬНЫ МУЗЕЙ
НАРОДНАГА ПІСЬМЕННІКА
БЕЛАРУСІ

libmogilev.by/chigrinov